**Тэма: Этнаграфічны турнір “Скарбы роднага краю”**

**Мэты:** падтрымліваць цікавасць да беларускай мовы і літаратуры як да вучэбных прадметаў і як да духоўнага здабытку народа; пашырыць веды пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі; развіваць моўную культуру, творчыя здольнасці школьнікаў; фарміраваць паважлівыя адносіны да сваёй Радзімы; выхоўваць пачуццё гонару і глыбокай павагі да нацыянальных традыцый, звычаяў, культуры.

**Абсталяванне**: карткі з нумарамі заданняў, карткі з заданнямі,крыжаванкамі, наглядны матэрыял.

## Ход турніра

У турніры ўдзельнічаюць 3 каманды.

Я запрашаю вас прыняць удзел у этнаграфічным турніры «Скарбы роднага краю», Вядома, што кожны чалавек непасрэдна звязаны з той зямлёй,на якой нарадзіўся. І канешне, кожны з нас павінен ведаць мінулае роднага краю, ганарыцца культурнай спадчынай сваёй краіны. Я спадзяюся, што сёння кожны з вас атрымае новыя веды, і зможа далучыцца да духоўных скарбаў роднай Беларусі. Яго правілы наступныя. Кожная каманда па чарзе адказвае на пытанні. Калі адна каманда не здолее адказаць на пытанне, балы залічваюцца той камандзе, якая першая агучыць правільны адказ. У канцы спаборніцтва мы падвядзём вынікі. Мне будзе дапамагаць падлічваць балы наша паважанае журы …

**Вядучая:** Зямля Беларусі! Бары і дубровы,
Жытнёвае поле, шаўковы мурог,
У промнях рабіны заход вечаровы,
Што клёкат буслоў – ручаёў перамовы
І ў шумных прысадах істужкі дарог.

П. Броўка. “Беларусь”.

Шырока раскінуліся абсягі беларускай зямлі. Тэрыторыя нашай краіны – каля 208 тысяч квадратных кіламетраў. Беларускі край славіцца гарадамі і вёскамі, рэкамі і азёрамі, багатымі і прыгожымі лясамі, лугамі і палеткамі. Але галоўнае багацце любой краіны – яе людзі, якія жывуць тут, ствараюць матэрыяльныя і духоўныя багацці, зберагаюць іх, каб перадаць нашчадкам.

**Першы тур**. ***Размінка.***

У мяшэчку запіскі з нумарамі пытанняў, удзельнікі каманд па чарзе іх дастаюць і называюць нумар. Вядучы гульні зачытвае пытанне пад дадзеным нумарам. На абмеркаванне даецца 30 секунд. За правільны адказ – 1 бал.

Пытанні:

**1**. Як называўся вядомы з XVI ст. лялечны тэатр на Беларусі? ( Батлейка )
**2**. Назавіце народнага ўмельца, які зрабіў славуты крыж Еўфрасінні Полацкай. (Лазар Богша )
**3**. Што дало падставы Уладзіміру Караткевічу назваць нашу Беларусь „зямлёю пад белымі крыламі”? (На Беларусі шмат буслоў)
**4.** Якое возера ў Беларусі называюць беларускім морам? (Нарач)

**5**. Прылада для памолу зерня, ручны млын (Жорны)
**6.** Якою была мянушка князя Усяслава Брачыслававіча? Чаму? (Чарадзей )
**7**. Назавіце імя першай беларускай жанчыны, прызначанай царквой да ліку святых. ( Ефрасіння Полацкая )
**8.** Першая кніга, выдадзеная Ф. Скарынам. ("Псалтыр".)
**9.** Як называецца беларускае свята, якое ўшаноўвае ўсіх памерлых продкаў. (Дзяды)
**10.** Пра які святочны дзень у народзе кажуць: «...да абеду плачуць, па абедзе пашуць, а к вечару скачуць»? (Радаўніца.)
**11.** Гэта рэч у народных звычаях і абрадах раней займала важнае месца. На Вадохрышча ўпрыгожвалі ледзяны крыж, на Сёмуху ахвяравалі бярозе, на зажынках ахіналі сноп у куце хаты. Пра якую рэч ідзе размова? (Ручнік)
**12.** Атрамант — устарэлае слова. Якое слова выкарыстоўваем замест яго сёння? *(*Чарніла.)

**Вядучая:** Любоў да Радзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа – яго перамог і паражэнняў, здабыткаў і страт, яго герояў, мысліцеляў, вялікіх майстроў.

Нам продкаў кемнасць захавала
Шмат весцяў дзіўных з быўшых год,
Хоць гэтых весцяў ўжо нямала
Ў няпамяць кінуў нам народ.
Усё ж яшчэ штось засталося
Унукам з прадзедаў жыцця…
Няхай жа гэтыя калоссі
Мінуць скаранне небыцця!

Янка Купала. Урывак з паэмы„Магіла льва”.

<u>**Другі тур.**</u> ***Гістарычны.***

Каманды запісваюць адказы на лістках „адным сказам”. За кожны правільны варыянт – 2 балы.

**1. „Магнацкі капрыз”.** Усе вы чулі пра род беларускіх магнатаў Радзівілаў. Гэта былі вельмі магутныя ўладары. Як і ва ўсіх багатых і магутных, у іх былі свае дзівацтвы. Аднаму з іх аднойчы захацелася праехацца на санях. Але на дварэ стаяла лета. Што зрабіў гэты багаты чалавек, каб задаволіць сваю прыхамасць? (<u>Засыпаў дарогу соллю.</u> На той час гэта было вельмі дарагой забавай, бо соль каштавала многа грошай.)

**2. „Княскае выратаванне”.** Аднойчы Ягайла зняволіў Вітаўта ў Крэўскім замку і загадаў моцна сцерагчы. Аднак Вітаўт уцёк. Яму дапамагла яго жонка Ганна, якая кожны вечар з прыслугай прыходзіла да мужа. Якім чынам Вітаўту ўдалося збегчы з палону?
(<u>Вітаўт пераапрануўся ў адзенне прыслугі</u>, а тая засталася замест яго ў крэпасці.)

**3. „Помста”.** Тысячу гадоў таму здарылася падзея, якую палічылі неабходным занатаваць летапісцы: полацкая князёўна Рагнеда зрабіла замах на жыццё свайго мужа, вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча. Наколькі вядома, нічога падобнага ў гісторыі ўсходніх славян больш не здаралася. За забойства мужа, нават за няўдалы замах, па законах веку князёўну абавязкова чакала смерць. Князь Уладзімір адпомсціў сваёй мяцежнай жонцы пакараннем, мабыць, больш страшным, чым смяротны ўдар мяча. Якім было пакаранне?
( Рагнеда мела ад Уладзіміра трох сыноў і дзвюх дачок. Праз некалькі дзён пасля замаху Рагнедзе абвясцілі, што яна больш ніколі не ўбачыць сваіх дзетак, апроч Ізяслава, разам з якім ссылаецца на жыхарства ў глухмень да вытокаў Свіслачы.)

**Вядучая:**
Народ мой, дзякуй, што нідзе
Мяне балюча не ўпікнулі
За твой далёкі век мінулы,
За сённяшні твой сіні дзень.

Г. Бураўкін. Народ мой…

Многія пісьменнікі і паэты часта ў сваёй творчасці звярталіся і звяртаюцца да нашай мінуўшчыны, да народнай спадчыны. Хто яны?

**Трэці тур. *„У каралеўстве крывых люстэркаў”.***

У Каралеўства крывых люстэркаў трапілі літаратурныя прозвішчы і імёны некаторых пісьменнікаў і паэтаў. Як вядома, у гэтым каралеўстве ўсё рабілася наадварот, а тут яшчэ і літары пераблыталіся. За дзве хвіліны трэба даць адказ на пытанне: „Хто трапіў у Каралеўства?” За правільны адказ – 1 бал.

Міксам Човінбагда - Максім Багдановіч
Бяку Солак - Якуб Колас
Рімузділа Чівактерак - Уладзімір Караткевіч
Ксімам Нкат - Максім Танк
Акян Пулака - Янка Купала
Сіваль Кабыў - Васіль Быкаў

**Вядучая:** Беларусы заўсёды адзначаліся працавітасцю, калі пачыналі рабіць любую справу, то абавязкава рабілі яе дасканала. Прывучалі да працы дзяцей. І так было заўсёды.
Дзяцей бацькі вучылі строга
Любіць саху, пчалу, зямлю
І аднаму маліцца богу –
Нялёгкай працы мазалю.

Е. Лось. Продкі.

Сёння мы пагуляем з вамі ў гульню„Работнікі”, якая вядома з пачатку XX ст. У яе ў свой час гулялі сялянскія дзеці, якія паўтаралі тое, што бачылі ў жыцці.

**<u>Чацвёрты тур.</u> *„Работнікі”.***

Неабходна хутка і дакладна даць адказ на пытанне. Каманды адказваюць па чарзе. За правільны варыянт адказу – 1 бал.

Мы ўмелыя работнікі, аратыя і плотнікі, сена касілі, будавалі дом, што рабілі… тапаром? - …рубілі.

<u>Далей па ўзоры:</u>

Мы ўмелыя работнікі, аратыя і плотнікі, сена касілі, будавалі дом, што рабілі…
нажом для рэзкі торфу - …(рэзалі);
цапамі - … (малацілі);
касой - … (касілі);
лазой - … (плялі лапці);
рубанкам - … (стругалі);
рагачом - … (пераварочвалі сена);
драўлянай сахой - … (акучвалі бульбу);
бараной - … (баранавалі поле);
плугам - … (аралі).

**Вядучая:** А вы ведаеце, што беларусы, папрацаваўшы шчыра і старанна, любілі і смачна паесці? Ды і цяпер любяць. Бульба, як вядома, у беларусаў лічыцца другім хлебам. У. Караткевіч у нарысе „Зямля пад белымі крыламі” сцвярджае, што беларусы ведаюць многа страў з бульбы, і ўказвае прыблізную колькасць.

- Якая ж лічба называецца беларускім пісьменнікам? (Тысяча.)

Але не адной толькі бульбай быў сыты беларус. Ды і не любіў есці ў самоце. Ні для каго не сакрэт, што больш гасціннага чалавека цяжка знайсці ў свеце.

Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
- Калі ласка, калі ласка ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!

П. Броўка. Калі ласка.

**<u>Пяты тур.</u> *„Смачны”.***

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Падкрэсліце адной рыскай толькі стравы. Час выканання – 2 хвіліны.

***Жур,*** магерка***, поліўка, мачанка,*** конаўка***, верашчака,*** брында, ***хрусты,*** панёва***, глазуха,*** мянташка***, локшыны, ламанцы,*** мачыльня***, наліснікі,*** абліваха***, панцак, калдуны,*** жырандоль***, капытка,*** жлукта***, узвар, збінец,*** гэбель***. (Вылучаныя — стравы)***

**Вядучая:** Беларускі народ любіць цікава правесці вольны час.

**<u>Шосты тур. „ *Адгадай крыжаванку ”.*</u>**

Раздаюцца крыжаванкі  адразу тром камандам.Час выканання – 2 хвіліны. За кожны правільны адказ – 1 бал.




**Па гарызанталі:**

1. "Цар" Белавежскай пушчы.
3. Зялёныя "лёгкія" краіны.
4. Старажытная расліна для вырабу тканіны.
5. Народны духавы музычны інструмент.
6. Самае вялікае возера Беларусі.
7. Птушка, сімвал Беларусі.
8. Кветка, якая ўпрыгожвае герб Беларусі.
9. Прадукт харчавання.

**Па вертыкалі:**

Назва нашай краіны.

**Вядучая:** Вось і скончыўся наш турнір. Падвядзём яго вынікі. Калі беларус хоча ўсвядоміць сябе беларусам, ён рана ці позна звяртаецца да гісторыі, да культуры свайго народа. Кожны чалавек павінен ведаць, дзе яго карані, адкуль ён родам, як жылі яго дзяды і прадзеды, як і чым сустракалі гасцей, якія мелі звычаі і традыцыі.

„ На Беларусі Бог жыве “, -
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль, і продкаў запавет,
І мовы залатая сталь, і нашых дум сусвет.

У. Караткевіч. „На Беларусі Бог жыве”.

Міксам Човінбагда –

Кіртомз Ядлубя –

Бяку Солак –

Рімузділа Чівактерак –

Ксімам Нкат –

Акян Пулака –

Сіваль Кабыў –

**Пяты тур „Смачны”.**

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Падкрэсліце адной рыскай толькі стравы.

Жур, магерка, поліўка, мачанка, конаўка, верашчака, брында, хрусты, панёва, глазуха, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, абліваха, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жлукта, узвар, збінец, гэбель.

**Пяты тур „Смачны”.**

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Падкрэсліце адной рыскай толькі стравы.

Жур, магерка, поліўка, мачанка, конаўка, верашчака, брында, хрусты, панёва, глазуха, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, абліваха, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жлукта, узвар, збінец, гэбель.

**Пяты тур „Смачны”.**

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Падкрэсліце адной рыскай толькі стравы.

Жур, магерка, поліўка, мачанка, конаўка, верашчака, брында, хрусты, панёва, глазуха, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, абліваха, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жлукта, узвар, збінец, гэбель.

*Дадатак 1*

1.Колькі літар было ў кірыліцы? (43, 24 – запазычаныя, 19 – увялі Кірыл і Мяфодзій)

2.Як называюцца словы, што рыфмуюцца ў гэтых радках?

Сябе паводзіў вельмі бойка,

Ды ўцёк, як пачалася бойка. (Амонімы)

3.Гэтае народнае свята заканчвае зіму і сустракае вясну. Асноўнымі стравамі з’яўляюцца малочныя. А ганаровае месца займаюць бліны з рознай мукі. (Масленіца)

4.Як называўся адзін з відаў пісьма, якім валодалі жрацы? Найбольш захавалася гэтае пісьмо ў Кітаі. (Іерогліфы)

5.Якой літары беларускага алфавіта пастаўлены помнік і дзе? (Літары Ў, у Полацку)

6.Якія кнігі перакладаў на беларускую мову Францыск Скарына? (Бібліі)

7.Гэта загадка, дзе патрэбна ўставіць ці выкінуць літару. Адгадайце лагагрыф.

Я расту ў шырокім полі, -

Кветачкі блакітныя,

К прыставіш, - і міжволі

Стану дрэвам пышным я.

(Лён – клён)

8.Назавіце 28 літару беларускага алфавіта. (Ы)

9.Апавяданне Уладзіміра Дубоўкі называецца “Дзядуля размаўляе з бацянамі”.

– *Хто такія бацяны?* (Буслы.)

10.Гэта рэч у народных звычаях і абрадах раней займала важнае месца. Пра якую рэч ідзе размова? На Вадохрышча ўпрыгожвалі ледзяны крыж, на Сёмуху ахвяравалі бярозе, на зажынках ахіналі сноп у куце хаты. (ручнік)

11. Якія два месяцы на паўднёвым курорце называюцца “бархатным сезонам”? (верасень, катрычнік)

12.Які гэта колер – ультрамарын? (Ярка-сіні)




**Па гарызанталі:**
1. "Цар" Белавежскай пушчы.
3. Зялёныя "лёгкія" краіны.
4. Старажытная асліна для вырабу тканіны.
5. Народны духавы музычны інструмент.
6. Самае вялікае возера Беларусі.
7. Птушка, сімвал Беларусі.
8. Кветка, якая ўпрыгожвае герб Беларусі.
9. Прадукт харчавання.

**Па вертыкалі:**
Назва нашай краіны.

**Пяты тур „Смачны”.**

У вас на картках запісаны назвы беларускіх народных страў і словы “самазванцы”. Падкрэсліце адной рыскай толькі стравы.

Жур, магерка, поліўка, мачанка, конаўка, верашчака, брында, хрусты, панёва, глазуха, мянташка, локшыны, ламанцы, мачыльня, наліснікі, абліваха, панцак, калдуны, жырандоль, капытка, жлукта, узвар, збінец, гэбель.